УДК 378.147:930:94-057.87

**Г. А. АЛЯКСЕЙЧАНКА**
(УА «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»)

# ПРАБЛЕМЫ ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ-ГІСТОРЫКАЎ (АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ)

*У артыкуле разглядаюцца актуальныя пытанні арганізацыі і вучэбна-метадычнага забеспячэння гістарыяграфічнай падрыхтоўкі спецыялістаў-гісторыкаў у рамках універсітэцкай сістэмы навучання. Знаёмства з «творчай лабараторыяй» класікаў і вядучых прадстаўнікоў гістарычнай навукі дае студэнтам неабходны вопыт планіравання, арганізацыі і правядзення навуковых даследаванняў.*

Памежжа XX–XXI ст. захоўвае адзнаку пераходнага стану сусветнай гістарычнай навукі, калі назіраецца франтальнае пераасэнсаванне прыроды пазнання мінулага, эпістэмалагічных стандартаў гістарычнага даследавання і навуковага фармата гісторыі ўвогуле [1, с. 13–34; 2, с. 10–11]. Частка вядомых спецыялістаў (Б. Р. Магільніцкі, А. І. Патрушаў, Ул. В.Согрын) аб’ядноўваюць гэты комплекс перамен паняццем «гістарыяграфічная рэвалюцыя», якое трапіла ў асобыя навейшыя в учэбныя выданні [3, с. 413].

Азначаныя змены закранулі і «дысцыплінарнае поле» гістарыяграфіі як спецыяльнай навуковай галіны гістраычных ведаў.

Канцэпт глабальнай гісторыі гістарычнай думкі Дж. Іггерса выклікаў у Еўропе і краінах «постсавецкай» прасторы паварот да стварэння абагульняючых інтэграваных курсаў. У 2008 г. такі варыянт быў замацаваны у дзяржстандарце спецыяльнасці «Гісторыя (айчынная і усеагульная)» у выглядзе дысцыпліны «Гісторыя гістарычнай думкі».

Адначасова з глабалізацыяй гістарыяграфіі адбываецца пашырэнне і дзіверсіфікацыя яе прадметнай зоны і метадалагічных падыходаў, уключэнне ў складаныя між-і полідысцыплінарныя практыкі даследаванняў. У гэтых умовах універсітэтскія курсы гістарыяграфіі павінны захаваць устойлівы навукова-вучэбны фармат і функцыянальную ролю ўнутры агульнай сістэмы гістарычных дысцыплін. У гэтай сувязі варта прыгадаць галоўныя параметры гістарыяграфічнай падрыхтоўкі спецыялістаў-гісторікаў.

У першую чаргу гістарыяграфія разам з метадалогіяй абагульняе шырокі комплекс акадэмічных характарыстык гістарычнай



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

навукі : прырода і заканамернасці ўзнікнення і развіцця гістарычных ведаў і гістарычнай думкі, эвалюцыя тэарэтыка-метадалагічных і праблематыкі даследаванняў, іх інфармацыйна-дакументальнай базы і агульнай навуковай інфраструктуры, а таксама – фарміраванне галоўных навукова-метадалагічных плыняў, напрамкаў і навуковых школ, дзейнасць і здабыткі іх найбольш значных прадстаўнікоў. У гэтым сэнсе акадэмік М. В. Нечкіна мела рацыю, калі вызначала гістарыяграфію як «рычаг унутры гістарычнай навукі, што вызначае павышэнне навуковага ўзроўню гістарычных даследаванняў» [4, с. 144].

Гістарыяграфія выконвае важную ролю як адна з ключавых вучэбных дысцыплін спецыяльнага цыкла. Сістэматызаваны і профільныя курсы гістарыяграфіі даюць студэнтам уяўленне аб гісторыі фарміравання сваёй прафесіі, яе галоўных дасягненнях і праблемах, а таксама забяспечвае іх неабходнымі для спецыяліста ведамі аб сучасным узроўні развіцця гістарычнай навукі, яе метадалагічным арсенале і навукова-даследчай практыцы.

Знаёмства з «творчай лабараторыяй» класікаў і вядучых прадстаўнікоў гістарычнай навукі дае студэнтам неабходны вопыт планіравання, арганізацыі і правядзення навуковых даследаванняў. Семінарскія і практычныя заняткі па курсах гістарыяграфіі разам с комплексам спецыяльных дысцыплін (гістарычным крыніцазнаўствам, метадалогіяй гісторыі і дапаможнымі гістарычнымі дысцыплінамі) дазваляюць студэнтам авалодаць шырокім апрабіраваным арсеналам метадаў і тэхнічных сродкаў даследавання як у межах яго эмпірычнага этапа, так і на яго канкрэтна-праблемным і тэарэтычным узроўні.

Такім чынам, матэрыял гістарыяграфічных курсаў стварае магчымасці для абагульнення, сістэматызацыі і трансляцыі навуковых здабыткаў, прафесійных норм і каштоўнасцей, для засваення будучымі гісторыкамі прафесійнай культуры і этыкі.

У рэалізацыі навукова-вучэбнага патэнцыялу гістарыяграфічных дысцыплін неабходна кіравацца прынцыпамі паслядоўнасці і пераемнасці, якімі абумоўлена паэтапнае асваенне дысцыпліны і адпаведна – фарміраванне неабходнага ўзроўню падрыхтоўкі студэнта як спецыяліста.

Аналіз сітуацыі на малодшых курсах сведчыць, што для значнай часткі студэнтаў паняцці «гістарыяграфія» і «гістарычная бібліяграфія» яшчэ не дастаткова дыферэнцаваныя. У мінулыя гады часткова выправіць гэтыя школьныя недапрацоўкі дазваляла вывучэнне курса «Уводзіны ў спецыяльнасць». Сёння пачатковае знаёмства з прадметам і функцыямі гістарыяграфіі студэнты павінны атрымаць праз уступныя лекцыі да базавых і спецыяльных курсаў, а таксама ў межах іх асобных тэматычных блокаў і канкрэтна-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гістарычных сюжэтаў. Асабліва запатрабаваным з'яўляецца зварот да гістарыяграфічных даведак пры разглядзе традыцыйна-дыскусійнай тэматыкі («Варагі і Кіеўская Русь», «Апрычніна», «Эпоха Пятра І», «НЭП і альтэрнатывы савецкай гісторыі» і інш.). Нельга таксама забываць, што ў працэсе вывучэння канкрэтна-гістарычнай праблематыкі і спецыяльных гістарычных дысцыплін часта ўзнікае неабходнасць у апеляцыі да навуковых аўтарытэтаў. Рэцэпцыя навукова-гістарыяграфічнай спадчыны буйнейшых вучоных можа адбывацца ў розных формах – зварот да «знакавых» навуковых прац, канцэпцый, гіпотэз, ацэначных меркаванняў.

Адначасова павінна вырашацца другая «стартавая» задача гістарыяграфічнай падрыхтоўкі студэнтаў – авалоданне яе канкрэтна-праблемнымі і прыкладнымі (арганізацыйна-метадычнымі) аспектамі. Гэтую задачу вырашаюць навуковыя кіраўнікі студэнтаў у працэсе падрыхтоўкі першых курсавых работ. З улікам спецыфікі перыяду адаптацыі студэнтаў пачатковых курсаў варта пазбягаць фарсіравання тэарэтычнага ўзроўню распрацоўкі праблематыкі і сканцэнтраваць студэнта на дэталевым вывучэнні эмпірычнай асновы даследавання і яго інструментальных складаючых – метадах эфектыўнага пошуку гістарыяграфічных крыніц, іх сістэматызацыі і тэматычнай апрацоўкі. У плане практыка-арыентаванай падрыхтоўкі важным у гэты перыяд з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў-курсавікоў навыкаў рэгулярнага асваення навейшай манаграфічнай і рэфератыўнай літаратуры, навукова-галіновай перыёдыкі і камп'ютарных баз і банкаў дадзеных. На гэтай аснове закладваецца імператыў штодзеннага самастойнага пашырэння навукова-эўрыстычнага гарызонта даследавання, удакладнення і развіцця яго фундаментальных і прыкладных аспектаў. «На выхадзе» у курсавой рабоце студэнтам даецца канкрэтная гістарыяграфічная схема, якая раскрывае змест і дынаміку праблемна-тэматычнага поля даследавання, а таксама яго навукова-інфармацыйнае і крыніцазнаўчае забеспячэнне [5, с. 89].

Пачатак спецыялізацыі вызначае новы этап гістарыяграфічнай падрыхтоўкі студэнтаў. Адпаведныя раздзелы, тэмы і заданні па спецкурсах і спецсемінарах павінны быць пераважна накіраваны на асваенне канкрэтна-праблемных блокаў гістарыяграфіі, якія вывучаюцца комплексна і паглыблена, на максімальна шырокай навукова-інфармацыйнай базе. У межах спецыялізацыі неабходна больш смела ставіць навукова-эўрыстычныя задачы, ў тым ліку – праблемна-аналітычнага і тэарытычнага ўзроўню. Для гэтага ёсць аб'ектыўныя падставы : да 3-га курса студэнты-гісторыкі атрымліваюць устойлівыя веды ў фармаце сацыяльна-гуманітарнай, культурна-антрапалагічнай і філасофскай падрыхтоўкі. Неабходна

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

таксама мець на ўвазе, што на мяжы 2-га – 3-га курсаў у студэнтаў назіраецца рост вучэбных матывацый, якія аб'ектыўна накіраваны на атрыманне прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў [6, с. 64]. Гэта стварае спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі акадэмічнай актыўнасці студэнтаў, фарміруе іх устойлівую зацікаўленасць, абумоўлівае сталы ўдзел у розных напрамках вучэбна-пазнавальнай і навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў.

На апошніх курсах вучэбнымі планамі прадугледжаны выхад на непасрэднае вывучэнне асноўнага (абагульняючага) і профільных курсаў гістарыяграфіі, якія даюць студэнтам сістэматызаваныя веды па гісторыі сваёй навукі, яе сацыяльных і навукова-пазнавальных функцыях, акадэмічных напрамках і школах, арганізацыйнай інфраструктуры і г.д. Узаемадапаўненне абагульняючага і профільных курсаў гістарыяграфіі дазваляе студэнтам засвоіць галоўныя тэндэнцыі гістарыяграфічнага працэсу і адначасова–яго важнейшыя асаблівасці (стадыяльныя, рэгіянальныя, этнакультурныя і інш.).

Такім чынам, на старэйшых курсах аб'ектыўна забяспечваецца выхад гістарыяграфічнай падрыхтоўкі на новы тэарэтыка-метадалагічны, праблемны і метадычны ўзровень, які павінен адпаведаць выніковым кваліфікацыйным патрабаванням адукацыйных стандартаў па гісторыі. Закладзены ў вучэбныя планы пяцігадовай падрыхтоўкі гісторыкаў міждысцыплінарны «трохкутнік» («Гісторыя гістарычнай думкі», «Гісторыя філасофіі», «Метадалогія гісторыі») забяспечвае аптымальны ўзровень тэарытычнага і канкрэтна-праблемнага асваення гістарыяграфічнага кампанента прафесійных ведаў гісторыка. У вучэбным працэсе гэтая мэта дасягаецца праз сістэмнае адзінства і мэтанакіраванае выкарыстанне дыдактычных і арганізацыйна-метадычных сродкаў.

Адпаведна гэтай схеме лекцыйныя курсы павінны выконваць ролю навукова-метадалагічнай дамінанты [7, с. 38] мець праблемна-накіраваны вектар і закладваць арыентырную аснову для далейшага асэнсавання матэрыялу студэнтамі. Звычайна гэта адбываецца на семінарскіх занятках, якія пашыраюць дакументальна-інфармацыйную базу аналізу ўзнятых у лекцыях праблем, маюць актыўны эўрыстычны характар, утрымліваюць элемент дыскусіі і развіваюць у студэнтаў навыкі публічных выступленняў, абароны прынятых навуковых пазіцый, карэктнага ўжывання фактычнага матэрыялу і аргументацыі. Асаблівае месца павінны заняць актыўныя формы семінарскіх заняткаў – «круглыя сталы», заняткі з выкарыстаннем метада малых груп і інш. Эфектыўнымі з'яўляюцца праблемна-аналітычныя семінары па абагульняючых тэмах. В якасці асновы ў іх правядзенні можна выкарыстаць «Форум»

«Социокультурные измерения истории : новые проекты», размешчаны ў вучэбным дапаможніку па метадалогіі гісторыі [8, с. 291–297]. Гэты «міні-ВМК» дазваляе ў ходзе прадметнай дыскусіі асвоіць галоўныя дасягненні і разгледзець праблемы і супярэчнасці сучаснай гістарыяграфіі на ўзроўні яе вядучых напрамкаў і навуковх школ. На гэтым узоры можна пабудаваць аналагічныя «форумы» па іншых этапах (перыядах) развіцця гістарычнай навукі.

Усе пералічаныя формы арганізацыі семінараваў у значнай ступені павінны стымуляваць развіццё пазнавальнай актыўнасці студэнтаў, іх творчага патэнцыялу і матывацыі да самарэалізацыі ў прафэсійнай дзейнасці [9, с. 74-75].

На індывідуальным узроўні эфектыўным сродкам развіцця навукова-даследчых інтарэсаў студэнтаў з’яўляецца падрыхтоўка праблемна-аналітычных рэфератаў, кейсаў, рэцэнзій і г.д. Важную ролю ў фарміраванні прафесійных кампетэнцый студэнтаў выконваюць вучэбныя і вытворчыя практыкі, гістарыяграфічны кампанент якіх трансфармуецца не толькі ў падрыхтоўку курсавых і дыпломных работ, але і ў навукова-метадычныя распрацоўкі для ўкараннеия ў вучэбный працэс (школьныя практыкі). На этапе пераддыпломнай (даследчыцкай) практыкі гістарыяграфічная падрыхтоўка студэнтаў апрабіруецца ў форме распрацоўкі рабочай мадэлі гістарыяграфічна-крыніцазнаўчага раздзела дыпломнай работы.

Пераход на чатырохгадовы цыкл падрыхтоўкі гісторыкаў пры скарачэнні аб’ёма гадзін патрабуе пэўнай перабудовы гістрарыяграфічнай падрыхтоўкі, якая, на наш погляд, павінна сегментарна закладвацца ў шэраг базавых і спецыяльных курсаў. Для забеспячэння зместавага адінства гістрарыяграфічнай тэматыкі ў перспектыве нельга выключаць варыянты модульнага падыхода, метадалогія і тэхналогія якога паспяхова распрацоўваецца беларускімі гісторыкамі [10, с. 7–12].

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**


1. Нові підходи до історіописання / за ред. П. Берка. К : Ніка-Центр, 2013. 368 с.
2. Бобкова М. С. «Historia Pragmata». Формирование исторического сознания новоевропейского общества. М. : ИВИРАН, 2010. 329 с.
3. Историческая наука в XX веке. Историография истории нового и новейшего времени стран Европы и Америки. Уч. пособие. М. : Простор, 2002. 432 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4. Зевелев А.И. Историографическое исследование : методологические аспекты. М. : Высшая школа, 1987. 161 с.
5. Аляксейчанка Г. А. Арганізацыйна-метадычныя праблемы падрыхтоўкі гістарыяграфічных разделаў курсавых работ студэнтамі-гісторыкамі // Актуальные вопросы научно-методической работы : обучающе-исследовательский принцип организации образовательного процесса. Гомель : ГГУ, 2002. С. 88–90.
6. Мурашко Е. А. Динамика мотивации студентов///Веснік БДУ. Серыя 3. 2005. №1. С. 60–64.
7. Сидорцов В. Н. Проблемы оптимизации социально-гуманитарного (исторического) образования // Веснік БДУ. Серыя 3. 2013. №1. С. 35–38.
8. Методологические проблемы истории. Уч. Пособие. Минск : ТетраСистемс, 2006.352 с.
9. Красовская Н. Н. Развитие познавательной активности личности студента // Вышэйшая школа. 2011.№3. С. 73–76.
10. Миницкий Н. И. Историческое образовательное знание в контексте социально-гуманитарных дисциплин //Гісторыя і грамадазнаўства. -2012. №5. С. 6–13.

УДК 378.016:3:37.09-057.875

**И. И. ЭСМАНТОВИЧ**
(УО «Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины»)

## РОЛЬ СОЦИЛЬНО-ГУМАНИТАРНЫХ ДИСЦИПЛИН В ФОРМИРОВАНИИ СПЕЦИАЛИСТА

*Высшее образование в Республике Беларусь вступило на путь инновационного развития, происходит его модернизация в русле Болонского процесса. Разработаны новые образовательные стандарты, где сделана попытка учесть глобальные образовательные принципы. Для того чтобы сегодняшние студенты вузов смогли разбираться в социальных и экономических преобразованиях, необходимо, чтобы образовательный процесс был открытым и гуманистически направленным. Подготовить специалистов с компетенциями не только в своей специальной сфере, но и обладающих социально-личностными компетенциями призваны социально-гуманитарные дисциплины.*

Современный образовательный процесс, основанный на принципе непрерывного процесса постоянной адаптации

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ